Турысты сказалі "трэба", Мінтранс адказаў "ёсць"

Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі сёлета адчула, што вялікая колькасць нашых грамадзян жадаюць правесці летнія водпускі менавіта на курортах сонечнай Балгарыі. Атрыманыя ў пачатку года ад балгарскага транспартнага ведамства 450 дазволаў на выезд турыстычных аўтобусаў у гэту краіну закончыліся ў нашым Мінтрансе ў самы пік лета. Аднак і Міністэрства транспарту, і Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў Балгарыі вельмі аператыўна адрэагавалі на просьбу беларускіх калег аб выдачы дадатковых дазволаў. Яны тут жа прывезлі і перадалі мінчанам усе неабходныя дакументы яшчэ на 250 турыстычных рэйсаў у сваю краіну. Транспартнікі спадзяюцца, што гэтай колькасці ўжо будзе дастаткова. Дарэчы, у мінулым годзе беларускія турыстычныя фірмы выкарысталі ўсяго 300 дазволаў для дастаўкі адпускнікоў у Балгарыю.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

Тэндэнцыі

Для чорнай металургіі надыходзяць чорныя дні

Над чорнай металургіяй краін СНД завіс дамоклаў меч перавытворчасці. Паводле даных Еўрапейскай эканамічнай камісіі (ЕЭК) ААН, сусветнаму рынку прадукцыі гэтай сферы індустрыі пагражае кароткатэрміновае перавышэнне прапанавання над попытам і сярэднетэрміновая перавытворчасць.

У толькі што апублікаваным 45-м аглядзе рынку чорнай металургіі, падрыхтаваным ЕЭК, выказваецца крайняя занепакоенасць велізарнымі маштабамі перавытворчасці, галоўным чынам у Расіі і Украіне. Паводле даных даследавання, такая сітуацыя ў гэтых дзяржавах захаваецца прынамсі да 2000 года, што прывядзе да закрыцця стратных прадпрыемстваў галіны і абвальнага скарачэння рабочых месцаў.

Вадзім МІЛІЦЫН, БелТА.

Переписка

Как это надо понимать?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

В 1994 году народ Беларуси избрал главу государства. (Кстати, автор этой статьи тогда не голосовал за Лукашенко.) В 1996 году тот же народ подтвердил на референдуме свой выбор. Так каждый считающий себя демократом должен набраться терпения, как бы ему ни был ненавистен, по вашему выражению, президент, и дожить до следующих выборов, заслужить доверие у народа и победить на выборах. А не делать со страной то, что сделали по нетерпимости большевики в 1917—1920 годах.

Господин Наумчик, ругая политиков из Москвы, не следует все же забывать, что в августе 1991 года они во главе с Ельциным преподнесли вам независимость, хотел ли этого белорусский народ или нет. Преподнесли, как говорится, на блюдечке с голубой каемочкой.

Статья изобилует занятными утверждениями: "Россия сбросила Шушкевича", "...спецслужбы России разработали программу антибелорусской пропаганды...", "Лубянка преследует вполне определенные цели: по возможности ликвидация страны как государства". И избиение депутатов Верховного Совета от БНФ 12-го созыва "осуществляли офицеры группы "Альфа", но при участии офицеров аналогичного российского подразделения". И будто "...сотрудники управления ФСБ по Москве и Московской области занимают высшие посты КГБ Беларуси". А далее "...ненавистный президент, но и Кремль...", "...для российских коммунистов и славянских шовинистов Лукашенко свой парень". А не кажется ли вам, господин Наумчик, что вы тут перебрали? Вдумайтесь — не шовинизмом ли попахивают ваши строки? Под словами "славянский шовинизм" я понимаю бэнээфовский шовинизм. Или белорусы уже не славянский народ?

Вот что я разделяю полностью в вашей статье, господин Наумчик, так это утверждение о том, что самый "крутой подъем сегодня имеют те белорусские бизнесмены, которые проводят операции с Россией и чьи интересы накрепко привязаны то ли к российским сырьевым ресурсам, то ли к российскому рынку". Абсолютно правильно утверждаете. Пока вы в Чехии не создали благоприятных условий белорусским бизнесменам для ведения бизнеса, только статьи оттуда пишете. А вот президент стремится интегрироваться с Россией, чтобы еще лучше работалось нашим бизнесменам.

На мой взгляд, не следует также переживать и преждевременно завидовать тому, что Лукашенко станет президентом России с присоединенной к ней Беларусью. Не беспокойтесь, господин Наумчик, там есть свои кандидаты, которые не пропустят его. Это и Лужков, и Лебедь, и Черномырдин, и Жириновский, и Явлинский, и другие. И это понимает Александр Григорьевич.

В статье вы рекомендуете своим единомышленникам из БНФ: "...не нужно безостановочно вояжировать в белокаменную, лучше отдать деньги народному фронту для выпуска антикремлевских листовок". Действительно, вам нужно сосредоточиться на "формировании международного общественного мнения" путем вояжирования с этими антикремлевскими листовками сразу в Лондон, Нью-Йорк. И Запад поможет, как вы утверждаете. Даже известный литературный персонаж великий комбинатор Остап Бендер был уверен, что Запад нам поможет.

В заключение хотелось бы посоветовать не забывать историю. В 1917 году после свержения царского правительства Ленин из Швейцарии вернулся в Россию и уже начал писать статьи будучи в родной стране. Возвращайтесь и вы, господин Наумчик, и пишите статьи, подобно ленинским "Кризис назрел", "Советы постороннего", где раскрываются пути и способы захвата власти. Да и надо бы всерьез написать глубокую, аналитическую статью, аналогичную этой обсуждаемой с названием, опять же по Ленину, "Уроки проигранных БНФ выборов в Верховный Совет Беларуси".

С уважением —

Владимир ВЕРНИГОРОВ, член Общества за свободный выбор языка обучения.

Минск.

Сумна!

Прэзідэнт запэўніў ветэранаў. А "вертыкальшчыкі" на месцах зрабілі выгляд, што гэта іх не тычыцца...

Віктар Рыгоравіч Янкоўскі прыехаў у сталіцу з Жодзіна. Па вельмі актуальнай праблеме: ці верыць друкаванаму слову ў дзяржаўных газетах?

Здавалася б, і шлях недалёкі: нейкіх тры-чатыры дзесяткі кіламетраў... Але гэтая адлегласць нічога не значыць хіба што для чалавека дужага, не зусім старога. А ён, Янкоўскі, удзельнік і інвалід Вялікай Айчыннай. І не просты. Партызан і воін. Адзначаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двойчы медалём "За адвагу"... Ёсць у Віктара Рыгоравіча і іншыя баявыя ўзнагароды, але асабліва ганарыцца ён першым медалём, які атрымаў маладым партызанам, і апошнім, які ўручылі ўжо франтавіку Янкоўскаму ў баях за Кёнігсберг, дзе ён быў цяжка паранены (давялося ампутаваць нагу). Карацей кажучы, ён — чалавек заслужаны, на няўвагу да сябе не скардзіцца, але жадае, "каб ва ўсіх справах поўная праўда была і справядлівасць таксама. А яшчэ — пачуццё меры. Ва ўсім. У тым ліку — ва ўзнагародах і абяцаннях"...

Франтавіка ж Янкоўскага непакоіла менавіта гэта: навошта вакол іх, удзельнікаў мінулай вайны, імітуецца столькі кіплівай дзейнасці, павагі і ўвагі, а яшчэ больш... абяцанняў з боку уладаў? Ці ж не надышоў, на яго думку, час пераглядзець падыходы да святкавання юбілеяў і гістарычных дат? Ну а калі ўжо кіраўнікі слова далі, дык чаму не стрымліваюць яго?

— Чыталі? — Тут Віктар Рыгоравіч Янкоўскі працягнуў нумар масавай рускамоўнай рэспубліканскай газеты і пальцам указаў на публікацыю на першай старонцы пад загалоўкам "Подготовка к празднику Дня Победы под личным контролем главы государства".

Словы, якія тут прыводзяцца, былі падкрэслены чырвоным алоўкам:

"...В областных и районных центрах, трудовых коллективах предприятий и организаций, в колхозах и совхозах будут проведены торжественные собрания с участием ветеранов Великой Отечественной войны, бывших партизан и подпольщиков с вручением им памятных сувениров и подарков. Не будут оставлены без внимания и семьи погибших воинов и партизан, им будут направлены праздничные поздравления и оказана материальная помощь..."

Віктар Рыгоравіч, які не дужа ахвочы да падарункаў, на гэты раз усё ж такі зацікавіўся (дзеля інтарэсу, і зусім не спартыўнага), што за сувенір яго чакае разам... з матэрыяльнай дапамогай. Тым больш "падбухторваў" на такія спадзяванні ўпэўнены тон газетных радкоў:

"Президент Беларуси взял под личный контроль подготовку к празднованию... Глава государства поручил... главам администраций районов разработать комплекс мероприятий по организации празднования этой даты".

Але адсвяткавалі на Беларусі 9 мая — Дзень Перамогі, потым 3 ліпеня — Дзень вызвалення, які зараз завецца Днём Рэспублікі, а пра сувенір для франтавіка (дарэчы, і матэрыяльную дапамогу таксама) мясцовыя ўлады забыліся. Вось і вырашыў Віктар Рыгоравіч удакладніць у Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, як сочыць апарат за выкананнем распараджэнняў кіраўніка дзяржавы на месцах. І з Мінску ў Жодзіна за нумарам 15/5-2126 паляцеў ліст (лічы, адпіска):

"В соответствии со статьей 4 Закона Республики Беларусь "Об обращениях граждан" Ваше обращение, поступившее в Администрацию Президента Республики Беларусь, направлено для рассмотрения Минскому облисполкому.

Начальник управления по работе с обращениями граждан А.Ф.Бондарева".

Пачыталі ў Мінскім аблвыканкаме караценькую, невялічкую паперку, патрымалі якісьці час у руках, пачухалі крыху патыліцу ды разважылі: "Мы і самі з вусамі. Не горш за таварыша Бондараву адказы пішам". І слова ў слова пераадрасавалі (чытай: адфутболілі) ліст далей — у Жодзінскі гарвыканкам. На тыя самыя мясцовыя ўлады, пра якія ветэран цікавіўся, ці існуе для іх службовы абавязак выконваць распараджэнні прэзідэнта. Але там чыноўнікі не лыкам шытыя: "падвох" заўважылі адразу. Вы, маўляў, пытаецеся наконт матэрыяльнай дапамогі, а мы вам лепш паведамім пра тое, як святкавалі Дзень Перамогі ў Жодзіне. А тут у гарадскіх уладаў ёсць чаму павучыцца, як і ёсць чым пахваліцца:

"В соответствии с планом мероприятий, посвященных Дню Победы, в трудовых коллективах города проведены собрания, посвященные этой дате. 7 мая 1997 года проведено общегородское торжественное собрание..."

Чытаў франтавік Янкоўскі і яшчэ больш здзіўляўся: ніхто яго не запрасіў ні ў працоўны калектыў (а амаль усе жодзінцы звязаны сваёй працоўнай біяграфіяй з БелАЗам), ні на агульнагарадскія ўрачыстасці. Разважыў, што, відавочна, памылка выйшла. Пацікавіўся ў сяброўфрантавікоў, а тых таксама "не заўважылі" ў родным Жодзіне.

Затое на жодзінскай вуліцы Купрыянава, 15 складаюць паперкі-адпіскі не горш, чым на мінскай вуліцы К.Маркса, 38. З "павагай" і тлумачэннямі, як у лісце за нумарам 195/03-1, які гарвыканкам 11 ліпеня г.г. адправіў на суседні праспект Леніна, 11 Янкоўскаму:

"Уважаемый Виктор Григорьевич!

Городской исполнительный комитет рассмотрел Ваше заявление, поступившее в Администрацию Президента...

В связи с трудным финансовым положением оказать материальную помощь ветеранам ВОВ за счет средств городского бюджета не представилось возможности. Централизованных ассигнований на указанные цели не выделялось.

В связи с празднованием Дня Республики (День освобождения от немецко-фашистских захватчиков и День Независимости) 3 июля 1997 года городской исполнительный комитет оказал всем ветеранам ВОВ материальную помощь в размере 150 тыс. руб. за счет средств, выделенных предприятиями и организациями города.

Зам.председателя исполкома А.Е.Изофатов".

Прачытаў колішні партызан і воін адказ з гарвыканкама і зноў задумаўся: калі атрымалі дапамогу ўсе франтавікі, чаму абышлі яго, інваліда Вялікай Айчыннай вайны? І дзе тады той "асабісты кантроль" А.Р.Лукашэнкі, калі абмінулі яго ў "самы святочны светлы дзень" — 9 мая?

Таму і прыйшоў у рэдакцыю "Народнай волі" "выліць душу", паразмаўляць, як выказаўся, з перабудоўчых пазіцый.

— Ёсць у мяне яшчэ адзін ордэн Айчыннай вайны I ступені, — прызнаецца Віктар Рыгоравіч. — Але яго за ўзнагароду не лічу. Бо ўручылі, як і любому франтавіку, у брэжнеўскія часы за... удзел у вайне. Гэта здзек над статусам ордэна. Вядома ж, у час вайны ўзнагароджвалі іх за подзвігі, здзейсненыя ў баях. А пасля вайны, як стала прынята, да юбілейнай даты... — Тут ветэран глыбока ўздыхнуў, зрабіўшы паўзу з словамі "Так, так...", і, паразважаўшы сам-насам, зноў загаварыў:

— Ці ж гэта не паўтор, праўда, далёка не ў лепшым варыянце, брэжнеўскіх часоў? — пачаў разважліва, памяркоўна франтавік і раптам дадаў: — Што б зараз ні казалі пра дарагога Леаніда Ільіча, але ж ён быў гаспадаром свайго слова ды ў дадатак клапаціўся (на самой справе і па-сапраўднаму!) аб ветэранах. Шмат, зразумела, было і паказухі і, так бы мовіць, нават залішняй увагі да нас, франтавікоў: я маю на ўвазе ўсё той жа баявы ордэн, які ўручалі з нагоды юбілею. Ільіч, вядома ж, не хацеў і нас пакрыўдзіць, бо сам тройчы Героем Савецкага Саюза стаў не толькі ў свае юбілеі і (было ж!) аднойчы проста ў Дзень нараджэння "па ініцыятыве" і "з падачы" Суслава. З чыёй падказкі робіцца і ў нас нешта падобнае? Зараз, у пасляперабудоўчы перыяд, калі вакол, здавалася б, павінна быць дэмакратыя, але ж прычым тут бюракратызм?

Віктар Рыгоравіч нагадаў не менш бюракратычную гісторыю пра лячэнне ў шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, што ў Бараўлянах.

Так здарылася, што апынуўся Віктар Рыгоравіч у тэрапеўтычным аддзяленні, у кардыялогіі (там іх дзве) "пад першым нумарам". Здаецца, і курс лячэння прайшоў, а выніку аніякага. Як адчуваў сябе "не зусім", так і засталося. Шчыра прызнаўся ў гэтым "свайму" ўрачу Любові Аляксандраўне Іўко. Тая адказала, што сама ўжо рабіла захады, каб прадоўжыць курс лячэння на 15 дзён ці выпісаць з сабою лякарства. А каштуе ж яно нятанна — пад два мільёны. Адкуль у інваліда-пенсіянера такія грошы? "Дзякуючы Любові Аляксандраўне і стаў на ногі, — прызнаецца Віктар Рыгоравіч. — Але ж начальнік аддзялення Аляксандр Ільіч лічыў па-іншаму. Ён адмовіўся і тэрмін прадоўжыць, і лекі выпісаць. Прыйшлося звяртацца... Паверыце? Да намесніка міністра аховы здароўя. У шпітальным адзенні (іншага выйсця не бачыў) і трапіў да яго на прыём. А свайго дамогся..."

Такі ён няўрымслівы і настойлівы чалавек, Віктар Рыгоравіч Янкоўскі, колішні партызан і баец, а галоўнае — барацьбіт за справядлівасць.

Калі вызвалілі Беларусь, Віктар Рыгоравіч мог бы заняцца мірнай справай, як кажуць, досыць наваяваўся і ў партызанах. Але ж ён папрасіўся на фронт. "Свой" — Трэці беларускі. З Чарняхоўскім на чале. І прайшоў баявым шляхам з 695-ым стралковым палком. Пакуль не быў цяжка паранены. Ды хіба ж мог ён адсядзецца ці схавацца за спіну старэйшага брата, Міхаіла Рыгоравіча, які ў партызанскія камбрыгі выбіўся? Яму хацелася быць падобным на яго — такім жа мужным, бясстрашным, кемлівым. І ён, як і ў верасні 1942 года ў партызаны, пайшоў у ліпені 1944 года на фронт. Добраахвотнікам. Маючы ўжо баявыя ўзнагароды. І не адну. Вось чаму яму як байцу 695-га стралковага палка, а да гэтага партызану атрада "За Радзіму" (брыгада "Во имя Родины"), вельмі ўжо хочацца бачыць плён у пераменах-змяненнях, што адбываюцца сёння. "А інакш ці ж за гэта ваявалі?" Ды ці так жа трэба ўшаноўваць франтавікоў, што засталіся ў жывых, ці так адносіцца да іх у лекавых і іншых установах, ці такі "клопат" павінны праяўляць мясцовыя ўлады аб іх, калі нават самы святы Дзень Перамогі стаў "асвечаным" фармалізмам ды азмрочаны шматлікімі абяцаннямі.

Віктар СВІРКО.

Народная Воля 14 ЖНІЎНЯ 1997 г.

Дайджест

Готов сдаться международному трибуналу "на почетных условиях"

Находящийся в розыске бывший лидер боснийских сербов Радован Караджич заявил, что готов сдаться международному трибуналу "на почетных условиях", сообщает "Франс Пресс" со ссылкой на немецкую газету "Зюддойче Цайтунг". Он предложил провести суд над ним на территории, принадлежащей боснийским сербам, в соответствии с сербским законодательством. При этом, добавил Караджич, международный трибунал сможет осуществлять контроль над процессом. Предложение сербского лидера стало достоянием гласности перед визитом в Боснию американского посла по особым поручениям Ричарда Холбрука. Одна из целей Холбрука — заставить всех участников конфликта — сербов, мусульман и хорватов — выполнить требования Дэйтонских соглашений и отдать скрывающихся военных преступников, в том числе Караджича, в руки международного трибунала.

О судьбе золота и других ценностей, награбленных нацистами, не все еще известно

Более 20 стран, включая Швейцарию, примут участие в международной конференции, посвященной судьбе золота и других ценностей, награбленных нацистами во время второй мировой войны, сообщает "Дэйли Телеграф". Конференция пройдет в Лондоне в декабре этого года. Участники конференции попытаются разобраться, сколько золота и ценностей награбили нацисты и какова его судьба. Например, сразу после войны Швейцария передала союзникам ценностей на сумму 400 миллионов фунтов стерлингов, но как показывают обнародованные недавно документы, это лишь малая часть средств, полученных этой страной от нацистов. Другие нейтральные страны — Швеция, Испания и Португалия — также, вероятно, получали золото от нацистов. Кроме того, известно, что значительные суммы денег были перечислены ими в конце войны в банки Бразилии и Аргентины.

На беговую дорожку выходят... роботы

Американский робот "Ланселот" вышел победителем на Международном "Гран-при" роботов в Токио, сообщает "Ассошиэйтед Пресс". Робот был сконструирован группой ученых университета штата Мэриленд. Он опередил более сотни соперников из Японии. "Ланселот" победил в номинации "Самый точный робот". Он смог пройти по овальной беговой дорожке, коснувшись восьми мишеней. Большинство его соперников просто развалились на части по пути. В ходе "Гран-при" роботы показывали свое умение во многих дисциплинах, среди которых были броски баскетбольного мяча в кольцо и уборка дома. Абсолютным чемпионом стал робот, изготовленный фирмой "Хонда", который умеет подниматься по лестнице подобно человеку.

...Хотя бы не началась война

Корреспондент "Крисчиан Сайенс Монитор" размышляет о будущем Тайваня. Намерение Китая во что бы то ни стало вслед за Гонконгом присоединить и Тайвань может привести к новому конфликту. По мнению автора статьи, отношения, сложившиеся между Китаем и Тайванем сегодня, до мелочей напоминают ситуацию 1949 года. Тогда, как известно, война между китайскими коммунистами и националистами завершилась победой первых, и националисты укрылись на Тайване. С тех пор в Пекине убеждены, что объявление независимости Тайваня послужит поводом к возобновлению войны. Сегодня старшее поколение тайванцев считает воссоединение с Китаем единственно правильным решением. Молодежь, наоборот, выступает за независимость. Поэтому есть все основания опасаться, что прогнозы Пекина относительно войны сбудутся. Если же Тайвань все же согласится воссоединиться с Китаем, то возникнет новый конфликт — на этот раз вокруг формулы "одна страна — две системы", пишет газета.

Кубинские врачи всегда найдут выход из трудного положения

Куба — страна альтернативного лечения, считает корреспондент "Атланта Джорнал Конституэшен". Пока медицинская промышленность Кубы переживает тяжелый кризис, медики находят спасение в народной медицине. Различные травяные настои заменяют анестезию во время операций, начиная от обычного удаления грыжи и кончая удалением катаракты. Большинство кубинцев давно забыло вид настоящего лекарства. Однако, как считает автор статьи, отсутствие современных препаратов их нисколько не огорчает, поскольку с помощью народных средств кубинские медики гарантируют излечение всех недугов — от астмы до облысения.

Вот так овчарка! И фермеры ею довольны, и дети...

Британские ученые создали первого робота-овчарку, пишет газета "Дейли Телеграф". Предполагается, что робот будет использоваться в фермерском хозяйстве для отпугивания хищников от стада. В некоторых случаях робот-овчарка будет выполнять функции пастуха. По информации газеты, японская компания "Сони", преследуя более гуманные цели, создала робота-собаку для детей. По команде такая "собака" начинает играть с мячом, вертеть в разные стороны головой и даже "брать след".

Каждый третий американец страдает от переизбытка веса

Газета "Крисчиан Сайенс Монитор" посвящает статью пристрастиям американцев в еде. Как утверждает автор статьи, за последние двадцать лет их вкусы резко изменились. Американцы стали меньше есть и больше интересоваться вопросами правильного питания. Однако, как считают специалисты, проблем от этого у них только прибавилось. Американцы не только не стали худеть, но наоборот. Сегодня каждый третий в Америке страдает от переизбытка веса. В то время как в 70-е годы, когда никто в Америке даже и не помышлял о диете, страдающих ожирением было всего двадцать процентов. А дело все в том, считают ученые, что, несмотря на правильное питание, американцы время от времени поддаются искушению съесть парочку гамбургеров, сандвичей или несколько пакетиков картошки. И, судя по результатам исследований ученых, искушению они поддаются чуть ли не каждый день, пишет в заключение "Крисчиан Сайенс Монитор".

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Мутнеют глазки Греты

Исчезает, как пыль на ветру, гордость Америки — кинофильмы. Ведь в США многие считают, что главный вклад Нового Света в мировую культуру — продукция Голливуда. Именно поэтому началась страшная паника, когда выяснилось: старые фильмы буквально испаряются — на пленках все бледнее становится улыбка Кларка Гейбла и все более затуманенным взгляд Греты Гарбо.

Как свидетельствуют результаты научного исследования, снятые до 1950 года фильмы — даже при соответствующем хранении — со временем становятся непригодными для просмотра, поскольку истлевает один из химических составляющих кинопленки. Не лучше обстоят дела и со снятыми после тридцатых годов цветными фильмами: они постепенно бледнеют.

Однако на днях появилась надежда, что лентам удастся избежать гибели: законодатели проголосовали за выделение 2,75 миллиона долларов на благородные цели спасения старых фильмов, а также за создание национального фонда, который позаботится об их консервации.

Даже с другом пуда много

Серьезную опасность для организма человека представляют консервы, поскольку, как правило, содержат большое количество соли. В результате изучения традиционных рационов питания свыше 10 тысяч человек из 32 стран канадскими медиками было установлено, что чрезмерное содержание соли в продуктах повышает кровяное давление. От этого, в свою очередь, возрастает опасность кровоизлияния в мозг и инфаркта.

По мнению авторитетного "Британского медицинского журнала", сокращение потребления соли всего на одну треть могло бы лишь в Великобритании предотвратить 40 тысяч смертельных случаев. Ученые советуют потреблять в день максимум 6 граммов соли. Это меньше, чем насыпанная с верхом небольшая ложечка. Во многих же консервах концентрация соли примерно такая же, как в морской воде. А содержание соли, скажем, в грибных консервах в пять раз выше, чем в соленом арахисе. Три четвертых части соли, которую потребляют большинство людей, "скрыты" в консервах и готовых блюдах.

Клей каменного века


Уже в каменном веке, т.е. сорок тысяч лет назад, люди пользовались клеем. Именно клеем, поскольку болты с гайками еще не были изобретены. Наши древние предки крепко-накрепко приклеивали деревянные рукоятки к каменному оружию и орудиям труда.

В ходе недавних раскопок в Сирии, в междуречье Пальмиры и Евфрата, археологи обнаружили каменные скребок длиной около восьми сантиметров и зубило. Оба предмета были, за исключением режущей поверхности, покрыты черным клейким слоем. Химический анализ показал: это битум — встречающаяся в природе смола каменного угля. В каменном веке, как и сейчас, люди подогревали его перед использованием.

Археологи испытали смолу, найденную вблизи раскопок, и оказалось, что она и в самом деле прекрасно клеит.

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Стоп-кадр



Корабли пустыни.

Традыцыя?

Каму Мірон псуе настрой, калі над Лёзна сцягі лунаюць? Бел-чырвона-белыя...

Жыхары гэтага прыгранічнага з Расіяй беларускага райцэнтра ўжо прызвычаіліся амаль кожнае свята сустракаць з... бел-чырвона-белым сцягам на самым бачным месцы. Дзе толькі не лунаў сцяг! І над адміністрацыйнымі будынкамі, і над воданапорнай вежай, і над завадской трубой... Карацей кажучы, усялякі раз, ды на такім месцы, што ўладам даводзіцца доўга чухаць патыліцу, каб зняць гэтае забароненае відовішча. А наўмыснік заўсёды пакідаў запіску, што гэта справа рук нейкага Мірона, які атрымаў сярод мясцовых жыхароў тытул Няўлоўнага.

Ведаючы, што перад чарговым святам сцяг абавязкова залунае, раённыя ўлады прадпрымалі крокі, каб злавіць наўмысніка. Пільнасць напярэдадні такіх падзей заўсёды падвойвалася. Але ўсё безвынікова: Мірон па-ранейшаму цвёрда трымаў рэпутацыю Няўлоўнага. Чакалі, зразумела, яго і на пачатку гадавіны з дня абвяшчэння Дэкларацыі аб незалежнасці краіны. І, мабыць, былі ўпэўнены, што злавіць, схапіць Мірона за руку — справа часу. Бліжэйшых гадзін перад святам. Бо дзейнічаў ён, як заўсёды, ноччу.

Але і Мірон не лыкам шыты. І на гэты раз ён абвёў улады... вакол пальца. Схітраваў так, што вывесіў сцяг не за некалькі гадзін да свята, а за суткі. Таму яго і не ўпільнавалі.

Ды і месца выбраў незвычайнае — 40-метровую мачту электралініі высокай напругі. Таму, каб зняць сцяг, прыйшлося выклікаць з Віцебска спецыяльную брыгаду электрамантажнікаў-высотнікаў, бо з мясцовых электрыкаў і пажарнікаў ніхто браць перашкоду не адважваўся. Людзей у брызентавых робах і касках палохала напруга ў 110 тысяч вольт, а электрыкам нечакана кружыла галаву вышыня. Вось чаму жыхары Лёзна з павагай аднесліся да няўлоўнага Мірона, які пакінуў аднадумцам на памяць тэкст-прысвячэнне і подпіс: "Ад імя сапраўдных мужыкоў Віцебшчыны".

А на пачатку жніўня ў Лёзна зноў лунаді бел-чырвона-белыя сцягі. У некалькіх месцах адначасова.

За кожным учынкам Мірона — сапраўдная мужнасць і чарговая нагода-повад для мясцовага насельніцтва пазласловіць наконт бездапаможнасці ўлад, якія так жадаюць бачыць яго за кратамі, бо той заўсёды псуе святочны настрой. Але не ўсім...

Віктар СТАРЦОЎ-СТАРАСЕЛЬСКІ.

Мозг дремлет — работает язык

Пища, богатая жирами, замедляет работу мозга, однако люди после нее становятся более общительными. Такой вывод сделали британские ученые, проводившие исследования о воздействии питания на организм. Результаты говорят, что высокое содержание жиров в пищеварительной системе значительно притупляет бдительность, снижает скорость реакции, негативно отражается на точности выполнения работы, требующей длительной сосредоточенности. Даже если человек потребляет больше калорий, его мозг и реакции не ослабляются так, как это происходит после приема жирных блюд.

Для выявления этих закономерностей были использованы 18 добровольцев, которых на протяжении трех недель кормили завтраками и обедами с высоким и низким содержанием жиров. После приема пищи они каждый раз проходили специальное тестирование. Совет "завтрак съешь сам" показал свою полную несостоятельность, так как жирная пища с утра еще более вредна для организма, нежели обильный обед. После утреннего акта чревоугодия испытуемые ощущали усталость, вялость, их движения и реакция были замедлены. Все это продолжалось около трех часов — ровно столько, сколько необходимо желудку, чтобы переварить "поставки". Завтракавшие продуктами с низким содержанием жиров, напротив, чувствовали необходимый прилив энергии, были активны и работоспособны.

"Углеводы делают человека более уверенным в себе, бдительным и напористым, — пояснила Анита Уэллс, исследователь из Центра по изучению питания человека университета в Шеффилде. — И хотя жиры вызывают сонливость и апатию, они также заставляют людей быть более дружелюбными, открытыми и разговорчивыми".

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Беларускі народны соннік

Дзеянні

(Працяг. Пачатак у №№111, 114, 119,126,129.)

Абамлець — прыкрая навіна.
Васілеўскі, **с. 9.**

Абдзіраць кару з дрэва — даведаешся аб праўдзе.
Васілеўскі, **с. 9.**

Абдзіраць скуру з авечкі — нявіннага скрыўдзіш. Гл. авечка.
Васілеўскі, **с. 9.**

Абкалоцца цярністаю раслінкаю — спаткаешся з перашкодамі і ўшчыплівасцю.
Васілеўскі, **с. 33.**

Абмерваць зямлю пад новы будынак — дрэнны знак; **пад сад ці гарод** — шчасце.
Васілеўскі, **с. 9.**

Абувацца ў старое абуванне — падарожжа, **новае абуванне** — незнаёмае падарожжа.
Васілеўскі, **с. 9.**

Адрэзаць ува сне сабе руку — памрэ хто або ад'едзе; **калі балела пры гэтым рука** — блізкі, **а калі не** — дык памрэ або ад'едзе хтось далёкі.
Васілеўскі, **с. 9.**

Адходзіць у дарогу, плачучы — будзеш весяліцца. Гл. плакаць.
Васілеўскі, **с. 9.**

Апранаць каго-небудзь у белую адзежу — хваліць; у чорную — нябожчык будзе. **Апранацца ў белую адзежу** — хараша, а ў чорную — людзі чэрнюць.
Ляцкий. **Материалы, с. 144.**

Араць, баразну весці — гэта на смерць.
Романов. **Опыт, с. 62.**

Араць — нядобра. Непрыемнасці. Труды.
Ляцкий. **Материалы, с. 144.**

Араць — будзе якоесь цяжкае дзела ці турбавацца.
Серж., **с. 39.**

Ашукаць каго — бач, каб сам не быў ашуканы.
Васілеўскі, **с. 10.**

Бажыцца — будзеш сведкай.
Васілеўскі, **с. 10.**

Бараніцца — клопат.
Васілеўскі, **с. 10.**

Бегці — прыдзецца завіхацца каля дзела.
Серж., **с. 39.**

Біць каго — нядобра: прыб'ецца чалавек,ругацца будзя і ўрэду дзелаць. Таксама: памірышся са злоснікамі.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Як сніцца, што кагось б'еш, то нехта знакомы прыб'ецца.
Pietkiewicz, **s. 212.**
Вар.: *Fed.,* **s. 212.**

Любая бойка ў сне прадказвае чый-небудзь прыезд у дом, госця. Простая бойка — прыезд хоць і дарагога госця, але не сваяка, у той час калі крывавая бойка заўсёды паказвае на прыбыццё госця з крэўных сваякоў. Узаемная і працяглая бойка паказвае на адначасовае прыбыццё двух і болей гасцей; перанясенне простых і крывавых пабояў ад каго-небудзь — прыбыццё нежаданага госця. Удары пры падзенні, брыканне каня, баданне кароў да крыві ці без яе паказваюць на прыбыццё госця з нядобрымі намерамі, безадносна — будзе гэта родны ці чужы чалавек. Але бачыць бойку без асабістага ўдзелу ў ёй — нечакана апынуцца госцем сваяка ці чужога, а таксама прыняць пачастунак, напр., у карчме. Бойка жывёл служыць, так сказаць, аддаленым водгаласам чалавечай бойкі і часта паказвае на прыблуднасць да чужога статку ці прыбыццё чужога незнаёмага чалавека.
Никифоровский. **Материалы, с. 135.**
Вар.: *Ляцкий.* **Материалы, с. 143;** *Шейн,* **III, с. 339;** *Серж.,* **с. 39;** *Васілеўскі,* **с. 11.**

Біць жонку — вялікая прыкрасць або хто-небудзь прыб'ецца.
Васілеўскі, **с. 18.**

Біцца жалезам — пачуешся моцным.
Васілеўскі, **с. 18.**

Блудзіш у сне і выйдзеш, то выйдзеш з бяды, а не — то чакае бяда, турма (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Заблукаць у лесе — перашкода. Гл. лес.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Заблудзіць у доме — клопат; **у лесе** — цяжкае дзела.
Серж., **с. 40.**

Будаваць новую хату — часам хаўтуры блізкіх, некаторым добрая змена жыцця.
Васілеўскі, **с. 11.**

Буяніць — неспакой з суседзямі.
Васілеўскі, **с. 11.**

Важыць хлеб — прыбытак; **абраза** — крэўны памрэ, а тое ж кажуць, што нехта павесіцца. Таксама: дождж пойдзе.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Валіцца з гары ўніз — няўдача.
Васілеўскі, **с. 12.**

Варажыць у сне — быццам не паможацца гору твайму.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Варыць што-небудзь — сварка будзе.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Вастрыць нажы — кепска; будзе бітва. Таксама: задумаць зло. Ураджайны год будзе, калі сон сасніўся вясной.
Ляцкий. **Материалы, с. 145.**

Везці з дому — нябожчыка вывозіць будзеш. Тое ж: к п'янству. Дзяліцца будзеш (сямейны падзел). **Везці ў дом** — сын павянчаецца; ураджай; прыбытак. **Вазіць сена ў пуню** — нябожчык.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Веяць хлеб — карысць. Гл. Хлеб.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Вінаваціць каго — спрэчка.
Васілеўскі, **с. 12.**

Вучыцца — пільнуйся свайго, мей рупнасць.
Васілеўскі, **с. 13.**

Вывозіць гной з двара — мерцвяка адтуль павязуць. А бачыць гной — сільна хворы будзе ў доме.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Выганяць быдла ўночы — небяспека ад пажару.
Васілеўскі, **с. 13.**

Выйсці замуж за маладога ці ажаніцца з маладой і прыстойнай жанчынай — абяцае хваробу і смерць.
Werenko, **s. 104.**

Выходзіць замуж — перамены ў жыцці (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Выязджаць з дому — зачнеш інтарэс ці службу.
Васілеўскі, **с. 13.**

Вянчацца — будзе сварка з прыяцелем.
Серж., **с. 39.**

Гаварыць ува сне самому з сабой — нявыяснёнае палажэнне, клопат, незадавальненне. Гаварыць ува сне — будзеш пацешаны.
Васілеўскі, **с. 14.**

Гаманіць — людзі судзяць.
Серж., **с. 39.**

Галіцца (брыцца) — госці, расходы.
Васілеўскі, **с. 14.**

Ганіць кагось — з цябе нехта смяецца.
Васілеўскі, **с. 14.**

Гінуць на вайне — небяспека, смутак.
Васілеўскі, **с. 14.**

Гнацца за кім — непатрэбна час страціш.
Васілеўскі, **с. 14.**

Грэбці сена — на хваробу і смерць.
Werenko, **s. 104.**

Грабці сена — клопат і цяжкая работа.
Серж., **с. 39.**

Грабіць сена зімой — неспадзяванае шчасце, **улетку** — таксама добра.
Васілеўскі, **с. 15.**

Гультаіць ува сне — перасцярога ад праўдзівага гультайства на яве (значэнне благое).
Васілеўскі, **с. 15.**

Давіць каго — несправядлівасць.
Васілеўскі, **с. 15.**

Дакучаць камусь гаворкай — пусты клопат.
Васілеўскі, **с. 15.**

Даручаць сваю справу камусь — хвароба або звальненне са службы.
Васілеўскі, **с. 15.**

Дарыць — дужа добра.
Васілеўскі, **с. 15.**

Дзівіцца з чаго-небудзь ува сне — пачуеш аб перамене.
Васілеўскі, **с. 15.**

Дзяліцца — убытак, аслабленне.
Васілеўскі, **с. 15.**

Дзяліць што-небудзь, жыта, сена — ураджай; тое ж: бацька памрэ, гаспадар на той свет пойдзе.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Дружыць з незнаёмым — карысць, даход.
Васілеўскі, **с. 16.**

Душыць каго-небудзь — дамавы скацінку тваю падушыць. Нядобра. Тое ж: хвароба задушыць.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Есці ў сне салёнае — добрыя весткі. Таксама: ураджай. І наадварот — голад (у прыватных выпадках гл. аддзел "Стравы").
Ляцкий. **Материалы, с. 145.**

Есці што-небудзь — галадаць.
Серж., **с. 40.**

Есці бліны — пісьмо атрымаеш;
— боб — клопат;
— булкі — ашуканства;
— грыбы — сцеражыся нястраўнасці;
— гарох — слёзы;
— гусінае мяса — пазбудзешся клопату;
— жарству — перашкоды, цяжкае жыццё;
— курынае мяса — паправіцца жыццё;
— паземкі — слёзы ад радасці;
— палын — хвораму здароўе, здароваму — хвароба;
— радыску — карысная навіна;
— слівы — нядобра;
— свініну — хвароба;
— хлеб — прыбыль, даход;
— цукеркі — для маладых — прыемная знаёмасць; старым — непатрэбны клопат;
— яйкі — здароўе, удача;
— яблыкі — добра.
Васілеўскі, **с. 17.**

Есці гарачую страву тарапліва — небяспечны даход.
Васілеўскі, **с. 13.**

Есці халаднік — заспакаенне дабра.
Васілеўскі, **с. 31.**

Ехаць на возе ці простых санях — беднасць, а ў карэце — гонар. **Ехаць верхам** — значыцца, скарыстуеш з дурака. Таксама: вецер будзець. Ехаць па чыгунцы — хвароба, небяспека.
Романов. **Опыт, с. 63—64.**

Верхам ехаць — гонар і слава; **у возе** — страта маёмасці. **Выехаць і вярнуцца за чым-небудзь** — захварэць і паправіцца.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Ехаць конна — добра, на возе — кепска.
Серж., **с. 40.**

Ехаць чыгункаю — хуткая перамена.
Васілеўскі, **с. 35.**

Жагнацца — будзеш мець падмогу, не траць надзеі.
Васілеўскі, **с. 17.**

Жаніцца — перамена.
Васілеўскі, **с. 17.**

Жаць ува сне не так-та харашо: сколькі снапоў нажнеш, столькі гадоў пражывеш. Жатву бачыць нехарашэ: возьмуць радню ў салдаты і не ўбачыш яго (упадзе, як падрэзаны колас). Гл. Жыта.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Жаць у сне — нягодна. Дзеці памруць ці сам. Кажуць: сколькі снапкоў пажынаеш, столькі веку дахаваеш.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

Калі сніцца жніво, то жаль нейкі будзе. **Жаць жыта** — то надта нядобры сон.
Fed., **s. 216.**

Жаць — даход.
Васілеўскі, **с. 17.**

Журыцца (маркоціцца, смуткаваць) — пацешышся, калі звернеш увагу на сваё здароўе.

Замаркоціцца — на здароўі малае аслабленне пачуеш.
Васілеўскі, **с. 18—19.**

Забагацець раптам — добры знак, калі бачыш да поўні месяца; благі адваротны, калі сніш з поўні.
Васілеўскі, **с. 18—19.**

Забаўляцца ў жмуркі — сон не мае вялікае вагі, але і нядрэнны.
Васілеўскі, **с. 19.**

Забыцца імя сваё — абгавор, няўдача.
Васілеўскі, **с. 20.**

Заваражыць (ачараваць) дзяўчыну — новае, але нядоўгае знаёмства.
Васілеўскі, **с. 19.**

Завешваць акно чым чорным — смутак або хваравітасць каго з сям'і.
Васілеўскі, **с. 19.**

Загавець у сне (не поснымі днямі) — будзе страта, якая пасля мусіць звярнуцца.
Васілеўскі, **с. 19.**

Загуляць у меры (не п'янеючы) — радасны знак даходу, знак карыснага інтарэсу. **Загуляць (п'янстваваць)** — будуць госці, інтарэс з чужынцам.
Васілеўскі, **с. 19.**

Зазімаваць на панадворку — сцеражыся судоў ці пажару.
Васілеўскі, **с. 19.**

Закалоць (забіць) свінню — пасля клопату будзеш мець заспакаенне тваіх жаданняў і дастатак у жыцці. (Сон не мае значэння, калі, кладучыся спаць, думаў аб гэтым.)
Васілеўскі, **с. 19.**

Залажыць фундамент у зямлю — пачнеш вельмі карысную працу.
Васілеўскі, **с. 19.**

Замяніцца хатамі з кім — перамена.
Васілеўскі, **с. 20.**

Зарэзаць авечку — мо думаў аб гэтым перад сном, дык сон не мае вагі, калі не, дык скрыўдзіш нявіннага чалавека.

Зарэзаць чырвонага пеўня — сцеражыся агню.

— ваўка — пазбудзешся вялікага ворага.
Васілеўскі, **с. 20.**

Засмуціцца — аслабленне здароўя. **Смутным быць** — развесялішся.
Васілеўскі, **с. 20, 27.**

Заўрочыць каго — нехта мае на цябе "вока".
Васілеўскі, **с. 20.**

Захварэць — смутак, нездавальненне.
Васілеўскі, **с. 20.**

Збіваць масла — пабагацееш.
Васілеўскі, **с. 20.**

Калі сніцца, што чуеш, як звоняць — жджы якоісь навіны.
Pietkiewicz, **s. 82.**

Згубіць штосьці — плакаць будзеш. Таксама: няўдача.
Романов. **Опыт, с. 62.**

Згубіш абутак, бот і не знойдзеш — страціш любімага друга (Смаргонскі р-н).
АІМЭФ, ф. 8, воп. 90, спр. 248.

Калі ўва сне штось загубіш, а найгорш шапку або ключ ад каморы чы ад кубла, то вельмі не пашанцуе, а калі што найдзеш, то добра.
Pietkiewicz, **s. 82.**

Здрыганушца ў сне — нехта памрэць са зроднікаў.
Романов. **Опыт, с. 61.**

Змагацца з кім-небудзь і перамагчы — добра, з бяды выйдзеш, а застацца пераможаным — у бяду пападзеш.
Ляцкий. **Материалы, с. 143.**

(Працяг будзе.)

Карьера "литзаписчика" Бориса Ельцина

39-летний журналист Валентин Юмашев — руководитель Администрации президента России. Кто он, как попал в ближайшее окружение Ельцина, его роль в политических играх?

Цена соавторства

Валентин Юмашев написал обе книги российского президента — "Исповедь на заданную тему" и "Записки президента", и Б.Ельцин в послесловии к первой из них прямо признал существование своего "литзаписчика" как соавтора и единомышленника. Гонорар В.Юмашева составили не деньги. Точнее, не только они.

Какая-то часть из миллионных сумм, выплаченных иностранными издательствами российскому президенту, была презентована соавтору.

Скорее всего, именно на эти деньги дочь В.Юмашева Полина учится в Великобритании в супердорогой милфордской частной школе вместе со старшим внуком президента Б.Ельцина Борисом Окуловым.

Главная награда

Однако главной наградой соавтору стала дружба с президентом и его семьей.

В.Юмашеву 39 лет. Родился в Перми, но в 16 лет вместе с родителями переехал в подмосковную деревушку. Он окончил факультет журналистики МГУ.

Параллельно работал курьером, а потом стажером в "Комсомольской правде", из-за чего частенько пропускал занятия.

От службы в армии "Комсомолка" его не спасла. После нее В.Юмашев попросился в "Московский комсомолец". В "Комсомолку" он, впрочем, вернулся через несколько лет, дошел до должности спецкора школьного отдела, сменил Павла Гутионтова на посту капитана "Алого паруса" — знаменитой тогда странички для старшеклассников. Был вполне лояльным и компанейским парнем, избирался секретарем комсомольской организации редакции, но особого пыла в этой работе не проявил, в аппаратчики не переквалифицировался. Проработал в "Комсомолке" до 1987 года, когда Виталий Коротич пригласил его в обновляемый "Огонек" — членом редколлегии, редактором отдела писем.

Судьбоносное интервью

И тут ему повезло. В.Юмашев оказался первым журналистом, сумевшим взять интервью у только что снятого со всех постов Б.Ельцина. Причем журналисту удалось разговорить собеседника, и в результате получилось не просто интервью, а некая исповедь. Но это не осмелился напечатать даже очень смелый по тогдашним временам "Огонек". Другие московские издания тоже предпочли не огорчать Михаила Горбачева, которого тогда все отождествляли с началом демократических перемен в стране. Ведь М.Горбачев уже сказал Б.Ельцину, что более не пустит его в политику, а такое интервью было именно возвращением.

Интервью было опубликовано в Риге в газете "Советская молодежь". Через некоторое время его перепечатали почти полторы сотни газет страны.

Свой человек в семье

С тех пор В.Юмашев стал часто появляться дома у опального политика. Там он подружился с Александром Коржаковым, который еще не считался "предателем", а наоборот, был первейшим другом, соратником и собутыльником будущего президента России. Молодой журналист очень понравился Наине Ельциной, стал в семье своим человеком — милый, неглупый парнишка, не рассчитывающий на какие-то дивиденды от этой дружбы, порядочный и честный. С таким хорошо сидеть за бутылкой и вести нескончаемые разговоры "за жизнь".

Б.Ельцину, видимо, тоже было с ним хорошо. Хотя президент понимал, что В.Юмашев не создан для какой-то официальной должности, административной работы. Даже внешний вид "друга семьи" выделялся своей "античиновностью", нелюбовью к строгим костюмам и галстукам.

Не признавал В.Юмашев и такого понятия, как "трудовая дисциплина", отсиживание "от сих до сих".

Вопрос на засыпку

Когда журналист "Комсомолки" Павел Вощанов пришел в Кремль первым пресс-секретарем президента России, именно В.Юмашев сказал своему коллеге и товарищу: "Павел, зачем ты сюда? Неужели не понимаешь, с какими людьми придется работать?" Теперь Павел Вощанов надеется при встрече задать В.Юмашеву тот же вопрос.

В.Юмашев продолжал работать в "Огоньке" и после ухода оттуда В.Коротича. И даже в должности его продвинули — до заместителя главного редактора. В 1995-м, когда "Огонек" совершенно запутался в долгах, "литзаписчика" и личного друга президента уговорили стать генеральным директором акционерного общества "Огонек" — в надежде, что такой человек сможет найти журналу богатых спонсоров. И В.Юмашев нашел — Бориса Березовского, с которым уже состоял в дружбе.

Влиятельные друзья

Что свело вместе этих людей, неизвестно, но сдружились они крепко и надолго. Именно В.Юмашев свел Б.Березовского с А.Коржаковым, и бизнесмен долгое время пользовался поддержкой главного телохранителя страны. Именно В.Юмашев свел Б.Березовского с дочерью президента Татьяной Дьяченко, а тот поспособствовал возникновению дружбы Татьяны с только что изгнанным из правительства Анатолием Чубайсом.

Потом эта троица — В.Юмашев, А.Чубайс, Б.Березовский — устроила Татьяне встречу с бывшим главой Национального фонда спорта Борисом Федоровым, который поведал дочери президента о "кознях", которые строит главный телохранитель А.Коржаков вместе с главным теннисистом страны, личным тренером президента Шамилем Тарпищевым, а также Михаилом Барсуковым и Олегом Сосковцом — главными противниками А.Чубайса.

Возмущенная Татьяна немедленно отправилась "открывать глаза" отцу.

Впрочем, козни были. Есть информация, что эта троица к апрелю минувшего года практически убедила президента в необходимости насильственного роспуска Государственной Думы и отмены президентских выборов.

И, дескать, именно В.Юмашев, Т.Дьяченко, А.Чубайс и мэр Москвы Ю.Лужков остановили уже занесенную над Госдумой президентскую карающую десницу.

Кабинет в Кремле

Рассказывают, что в последний год влияние В.Юмашева на государственные дела резко возросло. Но не непосредственное, хотя уже почти два года он числится советником президента и имеет кабинет в Кремле, рядом с президентскими апартаментами. Валентин Юмашев предпочитает не высовываться, а действовать через семью президента.

И вот итог: назначение Валентина Юмашева преемником А.Чубайса.

На первый взгляд, шаг совершенно глупый и для президента, и для самого В.Юмашева. Однако если взять и копнуть поглубже...

На эту должность было несколько кандидатур: Егор Гайдар, губернатор Нижегородской области Борис Немцов, два заместителя А.Чубайса, президент НТВ Игорь Малашенко... У всех — серьезный недостаток: это люди достаточно амбициозные. Приняв многообещающую должность, они, глядишь, попытаются перетянуть на себя хотя бы малую часть "властного одеяла", которое А.Чубайс намерен полностью забрать с собой в правительство.

В.Юмашеву все эти игры неинтересны, он вполне согласен быть эдаким зиц-президентом Фунтом.

То есть назначение В.Юмашева преемником А.Чубайса выгодно только А.Чубайсу. Он уже расставил в Администрации президента своих людей, определил им участки работы и пределы компетенции, за которые заходить не рекомендуется. А.Чубайс намерен и впредь руководить своими людьми в президентской администрации.

А поскольку правительство России сегодня тоже подбирает А.Чубайс, подбирает его "под себя", то власть А.Чубайса над Россией становится почти беспредельной.

Александр ПРОЦЕНКО.
Москва.

Чытач працягвае размову

